■ Родныя тапонімы

# ДУБОЧКІ І ДУБОВЫ ЛОГ

***«Зацікавіла рубрыка Ігара Капылова. Я з вёскі Дуброва Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці. Пра наша паселішча няшмат звестак з даўніны. Адлік вядзём ад 1592 года, але самога атласа, на якім была пазначана вёска, не бачылі. Цікава будзе даведацца пра паходжанне назвы нашай вёскі, прачытаць пра яе мінулае».***

**Людміла Бусел.**



**На пытанні адказвае старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ.**

Тапонімы з асновай *дуб* надзвычай папулярныя ў Беларусі. Пра гэта сведчаць такія назвы, як *Дубава, Дубавое, Дубавыя, Дубіна, Дубінкі, Дубіца, Дубішча, Дубкі, Дубнік, Дубнікі, Дубное, Дубовікі, Дубовы Лес, Дубовы Лог, Дубоўцы, Дубочкі, Дубы, Дубяні, Дубянцы* і многія іншыя, распаўсюджаныя фактычна па ўсёй тэрыторыі нашай краіны. Вельмі часта сустракаюцца і назвы, якія паходзяць ад найменя дубовага лесу — дубровы: *Дуброва, Дубрава, Дуброўка*. Многія з іх ужываюцца як састаўныя, з кампанентам, што характарызуе дубраву: *Белая Дубрава, Доўгая Дубрава, Зялёная Дубрава, Красная Дубрава, Мокрая Дубрава, Новая Дубрава* і іншыя. Яшчэ больш аналагічных тапонімаў было ў старажытнасці. У першую чаргу папулярнасць такіх назваў абумоўлівала земляробчая практыка беларусаў, лёс якіх быў цесна звязаны з суровымі рэаліямі лясіста-балоцістага краю. Падчас старажытнай падсечна-агнявой сістэмы земляробства культурнае асваенне зямлі пачыналася з выбару лясного ўчастка. Перш чым распачаць церабленне лесу, земляроб прыглядаўся да дрэўных парод, якія раслі тут, бо яны служылі прыкметай урадлівасці або неўрадлівасці глебы. Найлепш радзіла зямля пасля дуба. Акрамя таго, дубы мелі шырокае гаспадарчае выкарыстанне пры пабудове жылля, пры апрацоўцы шкур жывёл, у народнай медыцыне. У беларускай міфалогіі дуб выступаў сімвалам вечнага жыцця, а ў фальклоры ўспрымаўся як дрэва лёсу. Дуб часта ўзгадваецца ў розных відах вуснай народнай творчасці: казках, песнях, баладах, загадках і замовах.

Упершыню *Дуброва* ўпамінаецца ў 1592 годзе як дзяржаўнае паселішча, якое належала да маёнтка Бабруйск Рэчыцкага павета Вялікага Княства Літоўскага. Вёска *Дуброва* абазначана на Генеральнай карце «Беларускія землі ў XVI стагоддзі», змешчанай у «Вялікім гістарычным атласе Беларусі» (с. 139). У старажытных пісьмовых крыніцах вёска мела другі варыянт назвы — множналікавую форму *Дубровы*. У часы Рэчы Паспалітай назва вёскі ўжывалася ў паланізаванай форме — *Дамброва*, якая праіснавала да канца XIX стагоддзя, пра што сведчаць дакументы перапісу насельніцтва 1897 года. У канцы XVIII стагоддзя вёска належала каталіцкаму духавенству, з'яўлялася касцельным уладаннем. У часы Расійскай імперыі *Дуброва* згадваецца ў пісьмовых крыніцах як паселішча Чэрнінскай вобласці Бабруйскага павета Мінскай губерні. У другой палове XIX стагоддзя вёскай валодаў памешчык Адамовіч, пазней — памешчыца Лазоўская. На працягу XIX стагоддзя колькасць двароў і жыхароў нязменна павялічвалася: у 1850 годзе значылася 24 двары, у 1885 годзе — 65 двароў (515 жыхароў). У канцы стагоддзя ў Дуброве было 115 двароў з 753 жыхарамі. Дэмаграфічны рост адзначаецца і ў XX стагоддзі: у 20-я гады ў вёсцы быў 181 двор, а напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ўжо налічвалася 211 двароў і 795 жыхароў. На працягу сваёй гісторыі вёска з'яўлялася цэнтрам культурнага і гаспадарчага жыцця. Духоўнае жыццё падтрымлівалася царквой, культурнае — наяўнасцю школы, а эканамічнае — тым, што ў вёсцы працавалі вадзяны млын і кузня.

Пісьмовыя крыніцы засведчылі і трагічныя старонкі гісторыі вёскі. Дакументы захавалі сведчанні таго, што ў 1910 годзе вёску закранула эпідэмія халеры, у выніку якой памерлі 2 чалавекі, у змрочныя 30-я гады 22 вяскоўцы былі рэпрэсіраваныя. Але найбольш паселішча пацярпела ў час Вялікай Айчыннай вайны, калі ў 1943 годзе нямецкімі карнікамі была спалена 181 хата і забіты 110 жыхароў. А ў баях за вёску і вакол яе, паводле энцыклапедычных даведнікаў, загінуў 1191 воін, у іх ліку Герої Савецкага Саюза М. Цеплякоў і С. Чыгладзэ ■

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.22 | 16.47 | 7.25 |
| Віцебск — | 9.19 | 16.29 | 7.10 |
| Магілёў — | 9.12 | 16.37 | 7.25 |
| Гомель — | 9.00 | 16.42 | 7.42 |
| Гродна — | 9.36 | 17.04 | 7.28 |
| Брэст — | 9.28 | 17.13 | 7.45 |

### Месяц

*Поўня 14.12—20.12.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

**Пр.** *Андрэя, Антона, Апанаса, Івана, Канстанціна, Мікалая, Сцяпана, Сяргея, Уладзіміра.*
**К.** *Марыі, Ніны, Хрысціны, Валяр'яна, Віктара.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

## ЗАЎТРА





## Навагоднія падарункі ад «Звязды»




Як самым блізкім людзям, сваім чытачам мы падрыхтавалі сюрпрызы ўжо з першага нумара 2017 года. У ім усе, хто падпісаўся на «Звязду», атрымаюць (абсалютна бясплатна!) такі вось прыгожы стыльны насценны каляндар на тоўстай паперы, з добра бачнымі лічбамі.

У першыя дні студзеня разам з нумарамі газеты прыйдуць таксама календары канфесійных свят, народны каляндар і месяцавы каляндар садавода-агародніка.

***Заставайцеся са «Звяздой» — ідзіце ў нагу з часам! Няхай кожны дзень будзе добрым!***


Даты | **Падзеі** | Людзі

### 15 СНЕЖНЯ

*Міжнародны дзень чаю.*
*Заснаваны на Сусветным сацыяльным форуме ў Мумбаі (Індыя, 2004) і Порту-Алегры (Бразілія, 2005 г.) у сувязі з беспарапынным падзеннем коштаў на чайную прадукцыю.*
*Адзначаецца з 2005 года.*

**1850** год — нарадзіўся (г. Магілёў) Мікалай Канстанцінавіч Судзілоўскі, рэвалюцыянер-народнік, дзеяч міжнароднага рэвалюцыйнага руху, вучоны-натураліст, доктар медыцыны. Удзельнічаў у народніцкім руху ў Расіі, вёў рэвалюцыйную прапаганду сярод рабочых і сялян. З канца 1874 года — за мяжой: адзін з арганізатараў сацыялістычнага руху ў Румыніі; значна паўплываў на развіццё рэвалюцыйнага руху ў Балгарыі. Быў блізкі да групы «Вызваленне працы». З 1887 года — у ЗША, дзе займаўся медыцынай і публіцыстыкай. З 1892-га — на Гавайскіх астравах, дзе стварыў партыю незалежных і стаў яе лідарам, у 1900-м абраны членам сената, у 1901-м стаў прэзідэнтам Гавайскай рэспублікі. З 1906 года ў Кітаі, дапамагаў кітайскім рэвалюцыянерам зброяй. Аўтар прац па медыцыне, хіміі, філасофіі, сацыялогіі, геаграфіі. З яго імем звязаны дасягненні ў галіне хірургіі, тэорыі туберкулёзу і іншых хвароб. Судзілоўскі — першы падарожнік-географ, які пазнаёміў чытачоў з флорай і фаўнай астравоў цэнтральнай часткі Ціхага акіяна. Памёр у 1930 годзе.

**1856** год — надрукаваная апошняя частка рамана французскага пісьменніка Гюстава Флабэра «Мадам Бавары». Раман, які меў падзагаловак «Правінцыйныя норавы», у наступным годзе выйшаў асобным выданнем у двух тамах. Але ўрад прыцягнуў аўтара да суда па абвінавачванні ў абразе маралі. У 1857 годзе Флабэру ледзь удалося пазбегнуць абвінаваўчага прысуду, штрафу і забароны рамана.

**1921** год — 95 гадоў таму нарадзіўся (г. Капыль) Сцяпан Хусейнавіч Александровіч, беларускі літаратуразнаўца, пісьменнік, крытык, доктар філалагічных навук, прафесар. У 1950 годзе скончыў БДУ. Даследаваў гісторыю станаўлення новай беларускай літаратуры, кнігадрукавання і нацыянальнай перыёдыкі другой паловы XIX — пачатку XX ст. Аўтар аповесцяў «Далёкія зарніцы», «Ад роднай зямлі», «На шырокі прастор» і іншых. Стварыў літаратурныя партрэты беларускіх пісьменнікаў — П. Багрыма, Я. Купалы, Цёткі, К. Чорнага. Прымаў удзел у падрыхтоўцы да выдання творчай спадчыны класікаў беларускай літаратуры. Памёр у 1986 годзе.



**Было сказана**

**Алесь БАЧЫЛА, паэт:**
*«Сваёй бядзе — не лепшыя мы суддзі.*
*Цяжэй за ўсё*
*Свая ірвецца ніць».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Калі вы бачыце чалавека, які выпівае ў адзіночку, — не спяшайцеся з высновамі, магчыма гэта — карпаратыў індывідуальнага прадпрымальніка.**

Сяджу дома, галава баліць. Муж:

— Можа, табе аспірынчыку, можа, анальгінчыку, можа, чайку?..

Надзея на марціні з лёдам з кожнай хвілінай раставала ўсё хутчэй.

**Нам кажуць, што будзе вельмі снежная зіма. Сябры, у сувязі з гэтым хачу даць усім карысную параду: калі паркуецеся ў гурбу, трэба спачатку пераканацца, што яна не занята!**

— Вовачка, шчасце маё, мы з татам падорым вам на вяселле трохспальны ложак!

— Мама, навошта нам трохспальны?!

— Вовачка, няўжо ты думаеш, што мама кіне цябе адна-го з чужой жанчынай?!




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4968.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 снежня 2016 года.